Пралетарыі ўсіх краін, яднайцеся!

# Беларускі УНІВЕРСІТЭТ

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, МЯСЦКОМА, КАМІТЭТА КАМСАМОЛА І ПРАФКОМА
БЕЛАРУСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА імя Ул. І. ЛЕНІНА

№ 34 (621) Пятніца, 26 лістапада 1965 г. Год выдання XVIII Цана 1 кап.

# ЯК ТЫ РЫХТУЕШСЯ ДА СЕСІІ?

**Хутка бяжыць час. І гэта не таму, што дні ўсё карацей і карацей. Менш незанятых месц у бібліятэках: на парозе—сесія! Пагэтаму не згубіць ніводнай хвіліны стараецца студэнт. Перагортваюцца старонкі кніг, канспектаў. Рыхтуюцца да экзаменаў усе—і бязвусы першакурснік і ўмудраны вопытам многіх сесій выпускнік. Як жа лепш падрыхтавацца да таго ці іншага экзамена?**

**Сёння да студэнтаў-хімікаў звяртаецца прафесар Уладзімір Аляксандравіч Кажуроў.**

Фізічная хімія ўяўляе сабой навуку аб агульных законах хімічнага пераўтварэння. У метадычных адносінах яна з'яўляецца вынікам прымяненне фізікі да хімічных праблем. Пытанні, якія разглядаюцдаюцца фізічнай хіміяй, шматгранныя. Пагэтаму вывучэнне фізічнай хіміі патрабуе сістэматычнай працы не толькі ў аўдыторыі, на лекцыі, у лабараторыі, але і напружаных, самастойных, неаўдыторных заняткаў.

Неабходна з самага пачатку курса працаваць над вучэбнікамі і канспектамі лекцый. Пры гэтым працаваць над імі трэба з паперай і алоўкам у руках. Усе вывады, формулы, законы пасля таго, як прачытаеш кнігу ці канспект, трэба ўзнавіць у памяці, не падглядваючы ў кніжку, і яшчэ раз добра ўдумацца ў іх. Гэта першая ўмова зразумення таго ці іншага пытання. Работу над засваенне тэарэтычнага матэрыялу трэба спалучаць з рашэннем рэкамендаваных па курсу задач. Гэта дае магчымасць глыбей пазнаць значэнне формул на практыцы. Канкрэтызацыі ведаў садзейнічае і сумленнае выкананне лабараторных работ. Пагэтаму да іх трэба рыхтавацца грунтоўна.

Набліжаюцца экзамены. Для тых, хто прывык правільна і сістэматычна працаваць, экзамены—нічога страшнага: часу, які адводзіцца для іх падрыхтоўкі, дастаткова, каб паўтарыць і засвоіць ужо знаёмы матэрыял. Тым жа, хто да цяперашняга часу абмежаваў сваю вучобу толькі наведваннем абавязковых заняткаў, сесія, вядома, дасца ў знакі. Хіба толькі інтэнсіўнай самастойнай работай, цаной вялікіх намаганняў нагоняць яны ўпушчанае.



*Дыпламантка хімфака КАЦЯРЫНА ПІЛЬКО актыўна ўдзельнічае ў грамадскім жыцці факультэта. Стараннай вучобай і шчырымі адносінамі да сваіх аднакурснікаў яна заслужыла павагу і давер у студэнтаў.*

*Наш фотакарэспандэнт А. КАДЗЕТ сфатаграфаваў яе ў час лабараторных заняткаў.*

# ПАРТЫЙНА-ДЗЯРЖАЎНЫ КАНТРОЛЬ—У ДЗЕЯННІ

Група садзеяння партыйна - дзяржаўнаму кантролю на сваім пасяджэнні разглядала важнае пытанне «Аб стане вучэбна-лабараторнага абсталявання і яго выкарыстанні на фізічным, хімічным і біялагічным факультэтах». Было адзначана, што ранейшыя рэкамендацыі выконваюцца. На кожны прыбор і іншае абсталяванне заведзены ўліковыя карткі, якія своечасова запаўняюцца. Таксама заключаны дагаворы з асобамі, якія нясуць матэрыяльную адказнасць за захаванне прыбораў, абсталявання і іншых каштоўнасцей.

Але ў гэтай справе не ўсё яшчэ гладка. Здараецца, што тое ці іншае абсталяванне для лабараторыі ці прыбор заказвае адзін факультэт, а атрымлівае яго другі. Няма ва універсітэце адзінага цэнтральнага складу, няма таксама міжкафедральных і міжфакультэцкіх лабараторый. Ёсць выпадкі, калі прыборы ўводзіліся ў дзеянне несвоечасова. Так, біялагічны факультэт у жніўні гэтага года набыў ультрафіялетавы мікраскоп. Каштоўнасць яго 37 727 рублёў, але ён да гэтай пары не працуе.

Члены садзеяння партыйна-дзяржаўнаму кантролю ўскрылі і такі факт. Няма адзінага парадку ў праверцы правільнасці паказанняў прыбораў. Міністэрства вышэйшай, сярэдняй, спецыяльнай і прафесіянальнай адукацыі БССР не ў дастатковай колькасці забяспечвае лабараторыі неабходнымі матэрыяламі і хімрэактывамі. Універсітэт таксама не рэгулярна атрымлівае інфармацыю аб новым абсталяванні, якое выпрацоўвае наша прамысловасць.

Група ўнесла наступныя прапановы:

Лічыць мэтазгодным надаваць заяўкі на набыццё вучэбна-лабараторнага абсталявання толькі праз аддзел забеспячэння універсітэта.

Для больш эфектыўнага выкарыстання студэнтамі і супрацоўнікамі абсталявання і прыбораў мець агульнаўніверсітэцкую лабараторыю, каб ёю маглі карыстацца студэнты розных курсаў і факультэтаў. Для кваліфікаванага абслугоўвання гэтых прыбораў неабходна мець адпаведных спецыялістаў.

# Што? Дзе? Калі?

**УСЯ грамадскасць нашай краіны ўрачыста адзначыла 90-годдзі з дня нараджэння выдатных дзеячоў, публіцыстаў-ленінцаў Міхаіла Іванавіча Калініна і Анатолія Васільевіча Луначарскага. Студэнты і выкладчыкі універсітэта з цікавасцю вывучаюць іх багатую літаратурную спадчыну. У бібліятэцы, кабінетах была арганізавана выстаўка іх твораў. Дацэнт кафедры тэорыі і практыкі партыйна-савецкага друку М. С. Зярніцкі прачытаў студэнтам цікавую лекцыю «Важнейшыя этапы жыцця і дзейнасці М. І. Калініна». Змястоўнымі былі таксама даклады аб грамадскай дзейнасці А. В. Луначарскага аспіранткі А. Гарбачовай і студэнткі пятага курса І. Гурыновіч.**

**ДНЯМІ адбылася сустрэча студэнтаў падрыхтоўчага факультэта з намеснікам міністра Вышэйшай, сярэдняй спецыяльнай і прафесіянальнай адукацыі БССР М. І. Красоўскім, які расказаў прысутным аб развіцці вышэйшай адукацыі, аб дапамозе нашай краіны ў падрыхтоўцы нацыянальных кадраў для вызваліўшыхся з-пад імперыялістычных пут краін, адказаў на шматлікія пытанні студэнтаў.**

# ЛЕКЦЫЯ, СЕМІНАР, СЦІПЛАСЦЬ

Прайшло ўжо амаль два месяцы, як у нас пачаліся заняткі. У першыя дні на лекцыі хадзілі ўсе. Некаторыя прыходзілі нават на паўгадзіны раней. А цяпер...

Асабліва «праявілі» сябе Маркалёва і Давыдоўская. Пропускаў у іх ужо хапае, а скажаш ім пра гэта, пачуеш услед «Жандарм, а не староста».

Нашы студэнты жыццярадасныя, любяць пажартаваць, наладжваць дыскусіі. Але на ўсё свой час. А зноў жа Маркалёва з Давыдоўскай падаюць рэплікі на лекцыях, дыскутуюць на ўсю, калі другія слухаюць яе. Ну, думаецца, смелыя дзяўчаты, на семінарскіх занятках — вось дзе будзе разгон іх дыскусіям. Ды дзе там! На семінары іх не пачуеш. Толькі нішком корпаюцца ў канспекце, каб дачытаць адказ на пытанне выкладчыка.

Першы семінар у нас быў па гісторыі КПСС па рабоце Ул. І. Леніна «Што рабіць?». Семінар дапамог нам разабрацца ў многіх складаных і цікавых пытаннях. Але нельга сказаць, што ён прайшоў на высокім узроўні. Адчувалася слабая падрыхтоўка студэнтаў, недастатковае веданне першакрыніцы.

І гэта нягледзячы на тое, што студэнткі Мельнікава, Вярыга, Гліннік давалі, як нам здавалася, змястоўныя адказы.

Пасля семінара мы выразна адчулі, што чагосьці не даўлічылі ў падрыхтоўцы да яго. Мы—першакурснікі, і семінары ў нас толькі пачынаюцца. Як жа яны праходзяць на іншых курсах, як лепш да іх рыхтавацца?

Нам здаецца, што, можа, лепш было б, каб, напрыклад, Мельнікава рыхтавала адно пытанне, Вярыга—другое, Гліннік—трэцяе. Яны тады, пэўна, падрыхтаваліся б так, што ўсе мы засталіся б задаволенымі семінарам.

**Г. ПЯТРЭНКА,**
**староста 1-га курса аддзялення журналістыкі.**

***

**Нам стала вядома, што газета «Беларускі універсітэт» не заўсёды трапляе на біялагічны, хімічны, філалагічны факультэты. Зрэдку атрымліваюць яе таксама выкладчыкі, інтэрнаты. Просьба да таварышаў з камітэтаў камсамола факультэтаў, каб яны ўключылі гэтае пытанне на парадак дня чарговых пасяджэнняў і прынялі канкрэтныя меры.**

# *Двойка?—Дрэнна!*
## ТРОЙКА?
# *А чым яна лепш?!*

**Рэдакцыя атрымала ліст ад нейкага Віталія В. Друкуем яго без змен.**

Шаноўная рэдакцыя! Нядаўна прачытаў ваш артыкул «Двойка?—Дрэнна! Тройка?—А чым яна лепш?!» Я крыху падумаў і рашыў вам напісаць. Як ні як, тройка — гэта ж так званая дзяржаўная ацэнка і чаго вы так супраць яе ваюеце? Я вось ужо чацверты год атрымліваю гэтую, як вы кажаце, няшчасную тройку, але нічуць не больш нешчаслівы, чым тыя, што пнуцца з усіх сіл. І ў інтэрнаце жыву, і стыпендыю маю, і нагрузак ніякіх, бо мне трэба «падцягвацца». Можа хто не паверыць у маю адкрытасць, але так яно ёсць, і чаго мне саромецца. І ўвогуле, я думаю, пакуль будзе чатырохбальная сістэма, будзе і тройка і двойка. І, па-мойму, тройка, асабліва моцная,—зусім нармальная ацэнка.

З прывітаннем Віталій В.

**Якая думка на гэты конт у вас, таварышы? Слова за вамі!**

# НА СЦЭНЕ—ПОЛЬСКІЯ АРТЫСТЫ

У актавай зале універсітэта жарты, вясёлы смех. Нашы студэнты сустракаюць гасцей—маладзёжны польскі тэатр мініятур «Гібрыды».

Канцэрт закончаны, але гледачы не спяшаюцца разыходзіцца. Паміж імі і артыстамі завязваюцца знаёмствы, таварыскія гутаркі.

І зноў—жарты, вясёлы смех...

Тэатр «Гібрыды» непрафесіянальны, у яго складзе толькі 12 самадзейных артыстаў. Але яго маленькі калектыў жыве багатым і цікавым творчым жыццём.

Поспехаў вам, нашы сябры!



## Фотарэпартаж

*Нібы сама вясна прыйшла ў спартыўную залу нашага універсітэта — столькі маладосці ўбачыў я ў рухах спартсменаў-гімнастаў у час звычайных заняткаў. Звыш 80 чалавек налічвае гэтая секцыя. Узначальваюць яе вопытныя выкладчыкі Шапялевіч, Ішчанка, Бедакурава, Агібалава. У секцыі цяпер—тры майстры спорту, пяць кандыдатаў у майстры, шмат першаразрадні-каў. Раіса Чэхава, Валерый Файнберг, Леў Мардынін шмат год адстойвалі гонар нашага універсітэта на гарадскіх і рэспубліканскіх спаборніцтвах.*

*На першым здымку вы бачыце гімнастку Галю Фральцову. Яна рыхтуецца да гарадскіх спаборніцтваў. У гэтым годзе Галя рашыла стаць майстрам спорту. Пагэтаму так многа працуе цяпер над сабой, зноў і зноў адшліфоўваючы кампазіцыю выступлення на «кантрольным снарадзе», як называюць бервяно спартсмены. Гэты адзіны снарад у гімнастычным шматбор'і прыносіць столькі непрыемнасці, колькі ўсе астатнія разам узятыя.*

*Радуе трэнераў і папаўненне. Праўда, у рухах навічкоў шмат яшчэ недакладнасцей, але так пачыналі амаль усе... Мінулагодняя выпускніца інстытута фізкультуры Рагіна Агібалава энергічна ўзялася за навічкоў. У яе секцыі зараз 20 выпускніц. На здымку вы бачыце выкладчыцу са сваімі выхаванкамі Наташай Ярэмчанка, Машай Сарокінай, Валяй Комар.*

*Тэкст і фота А. Кадзета.*

## САДОЎНІК ЦУДОЎНАГА БААБАБА

*КНІГІ ТВАЙГО ВЫКЛАДЧЫКА, СТУДЭНТ!*

«У дні, калі прыйдзе канчатковая перамога, нашы нашчадкі будуць з найвялікшай павагай перагортваць кнігу гісторыі» — гаварыў А. В. Луначарскі.

І ён не памыліўся. Мы чытаем яе з гордасцю, павагай і захапленнем, успамінаючы імя і аднаго з самых адукаваных і таленавітых людзей. Напісанае Луначарскім па філасофіі і літаратуры, педагогіцы і гісторыі, этыцы і рэлігіі, музыцы і мастацтву, архітэктуры і тэатру — праяўленне яркіх граней таленту гэтага чалавека. І ўсё новыя і новыя даследаванні даюць нам мажлівасць пазнаць веліч грамадскага дзеяча, багатую спадчыну вучонага і літаратара. Сярод іх і работа выкладчыка нашага універсітэта А. С. Малініна «Луначарскі аб пралетарскіх пісьменніках», выдадзеная выдавецтвам «Вышэйшая школа», займае сваё пэўнае месца.

Цікавыя ў ёй старонкі аб сувязях А. В. Луначарскага з маладымі пралетарскімі паэтамі першага дакастрычніцкага прызыву.—Кірылавым, Герасімавым, Александроўскім, Самабытнікам, у творчасці якіх Луначарскі бачыў «пачатак новай агульначалавечай культуры». Даследуе аўтар адносіны Луначарскага і да камсамольскіх паэтаў Безыменскага, Жарава, Уткіна і Дароніна.

Падрабязна спыняецца даследчык таксама на пытанні «Луначарскі і пралеткульт».

Цікавыя факты сабраў аўтар у раздзеле, дзе гаворыць аб Маякоўскім, Фурманаве, Серафімовічы і стаўленні да іх А. В. Луначарскага. Трэба згадзіцца з ім, што Луначарскі сапраўды быў «самым справядлівым сярод сучасных крытыкаў Маякоўскага».

На аснове новых архіўных дадзеных, матэрыялаў перыёдыкі тых год аўтару ў цэлым удалося раскрыць ролю, якую сыграў Луначарскі ў стварэнні «вялікай літаратуры» у паслякастрычніцкі час. Луначарскі верыў, што прыйдзе час, і, як магутны баабаб, разніме сваю крону савецкая літаратура. І ён зрабіў многа дзеля здзяснення сваёй мары, у чым і пераконвае даследаванне А. С. Малініна.

**А. ПЛАЎНІК,**
**аспірантка.**

## ДЗЕ ПАВЕСІЦЬ ПАЛІТО?

Вучэбны дзень у нас, як вядома, пачынаецца а 8-ай. Спяшаемся. Аднак, мы думаем не пра лекцыі, не пра семінары. Думаем: «Дзе павесіць паліто?.. Добра было летам...»

Хутка восем. Вестыбюль галоўнага корпуса. Велізарная чарга. Праходзіць 5—10 хвілін, а яна не меншае. Крыўдна становіцца, што прыйшоў на заняткі загадзя, а з-за гардэроба спазняешся. І так кожны дзень.

Гардэробшчыца, у сваю чаргу, вінаваціць нас: «Чаго позна прыходзіце?» Але хіба гэта позна, калі стаіш у чарзе 10—15 хвілін?

— А бывае, што гардэробшчыца зусім не бярэ паліто: «Месц няма». А яны ёсць, гэта няма нумаркоў. Яны пагубіліся за лета, а каб знайсці іх, ніхто не паклапаціўся.

Гардэробшчыцы працуюць кепска. Штомесяц бачыш тут усё новых і новых, таму яны не ведаюць, дзе знаходзіцца які нумар, блытаюць паліто і нізавошта лаюць студэнтаў.

Бывае таксама, што працуе адна толькі палавіна гардэроба. Ці гардэробшчыцы не знаходзіцца, ці адміністрацыя лічыць, што хопіць студэнтам і палавіны, а вынік усё той жа: «Дзе павесіць паліто?» А магла б адміністрацыя размеркаваць гардэроб па факультэтах і на грамадскіх начатках у дапамогу гардэробшчыцам перад заняткамі і пасля назначаць аднаго ці некалькі студэнтаў.

Ды пакуль будзе думаць адміністрацыя, я бягу са сваімі сяброўкамі ў хімічны корпус. Кажуць, там ёсць у гардэробе месца, дзе можна павесіць паліто.

**А. ФРЫДМАН,**
**студэнтка матэматычнага факультэта.**

Фельетон

## і дым КАРОМЫСЛАМ

Гэты дзень лічыцца шчаслівым—15-ты дзень кожнага месяца. Можна заўважыць, як пасля лекцый неяк па-асабліваму ажывае студэнцкі інтэрнат. Усе бегаюць, мітусяцца, нясуць скруткі нейкіх закупаў: адзін—добры ахапак кніжак, другі — абновы, трэці—білеты на «Паўлінку» сабе і сваёй абранніцы. Але вунь нехта, сагнуўшыся ў тры пагібелі, цягне пукатую, натапыраную сумку, накіроўваючыся да пакою № 283.

Падзеі перад гэтым у жыцці яго насельнікаў нарасталі паступова, без трывог. З лекцый ніхто не ўцёк: чакалі стыпендыі. Атрымаўшы, па дарозе дамоў—заспрачаліся:

— Што? Возьмем цяпер ці пачакаем?—спытаўся загадчык гаспадарчай часткі пакою № 283.

— Пачакаем. Трэба зайсці дадому, захапіць сумку, бо ў кішэнях неяк нязручна. Ды і яшчэ нарвемся на каго-небудзь са студсавета,—адказаў напарнік загадчыка гаспадарчай часткі.

Прыйшлі бімбусы дадому, знайшлі пустыя кашалькі, напоўнілі грашыма і, невядома для чаго, пацалавалі іх і перахрысціліся. Пасля адкінулі ў шапку па тры рублі.

— Мала,—сказаў загадчык гаспадарчай часткі, — яшчэ па рубліку на прыкуску.

— А можа хопіць,—пачуўся цвярозы голас з кутка. — Помніш, сколькі валтузні з табою было ў мінулую стыпендыю. Добра, што вяроўку знайшлі.

— Хлопчыкі, і праўда!... Але па рубліку ўсё ж яшчэ кінем. А што якое, вяжыце, дазваляю, нават прашу, толькі вузлы не вельмі зашморгвайце, каб не ціснулі...

А праз якой паўгадзіны экіпаж пакою ў няпоўным складзе (адсутнічаў Р. Семашкевіч) сядзеў за сталом, на якім ляжала абыякава нарэзаная закусь. Паціраючы насы, хлопцы кулялі чарку за чаркай. Вось ужо адзін з іх сагнуўся, як турэцкі лук, над вядром, а другога пачало забіраць: ён спяваў, таўкучы пад бок напарніка:

Мы і піць будзем
І гуляць будзем...

Ледзь адагнуўшыся ад вядра, у нейкі момант напарнік загадчыка па гаспадарчай частцы ўспомніў, што не здзяйсняе наказ свайго таварыша. Паўпрытомнымі, шклянымі вачыма ён пачаў шукаць па кутках вяроўку і, балазе, што яна была ля самага вядра, пераможна ўскінуў яе нд сваёю ачмурэлаю галавой.

Загадчык гаспадарчай часткі здагадаўся, што прыйдзецца яму ляжаць звязаным, і дзе ўжо тады ён скончыць сваю цудоўную песню «І піць будзем і гуляць будзем...» А грозны супернік наступаў ад дзвярэй, памахваючы таўшчэзнай вяроўкай. Раз'юшаны ахвотнік спяваць кінуўся на свайго сабутэльніка. Як гладыятары, яны доўга тузалі адзін аднаго за бакі, але той, у каго ў руках была вяроўка, відавочна пачаў перамагаць спевака. Заставаўся адзіны выхад—акно. І прахожыя з тратуара бачылі, як на пятым паверсе нехта біўся галавою аб шкло, а яго ўсё адцягвалі і адцягвалі ўглыб пакою. Так ад шкла ў акне і памяну не засталося, ды вузлы на руках у спевака былі заціснуты па ўсіх правілах.

Мы не ведаем, што снілася звязанаму Валянціну Якаўлеву (II курс рускага аддзялення) і як адчувалі сябе яго пераможцы. Але мы ведаем, што ў гэты ж вечар рабілася па суседству. Каромыслам стаяў дым у пакоі 127. Гэта А. І. Мыслівец прынесла сваім сяброўкам-пяцікурсніцам Камашэнкавай, Мірончык, Доўнар цыбук, накшталт люлькі Тараса Бульбы, і ўсе пасмактвалі яго з найвялікшай асалодай. Камашэнкава нават выходзіла на калідор. Ёй хацелася абавязкова сустрэць трэцякурсніцу Савіну, каб і тая хоць разок смактанула з цыбука. Але Савінай было не да яго. Смяртэльна белая, як здань, выпаўзла яна са свайго пакою, і калідор ёй здаваўся, як палуба карабля ў дзевяцібальны шторм. Савіна смактанула перад гэтым больш дзейснага, саракаградуснага сродку.

Ад дыму рабілася млосна, і мы падаліся паверхам вышэй, адчынілі дзверы 237 пакою і—лепш бы мы іх не адчынялі! Смецце ў калена, вэрхал на ложках, на стале недаедзены селядзец рабым вокам упіраўся ў чырвоны агрызак памады. А туземцы гэтага фешэнебельнага пакою, другакурснікі рускага аддзялення Галанчык, Тоўсцік, Нікіценка, Сасноўская, Бранавец нават не пачырванелі, ўбачыўшы нас.

І паверце, якія мы былі радыя, калі сустрэлі, нарэшце, каменданта інтэрната Георгія Міхайлавіча Рабцэвіча. Ён запэўніў нас, што бачанае—адзінкавыя непрыемныя факты.

— І каб не было на каго раўняцца,—гаварыў камендант, — а то столькі харошых хлопцаў і дзяўчат у інтэрнаце!..

І ён назваў нам студэнтаў з пакою № 111, 143, 179...

**П. ПАРАХОНЧЫК.**
**Малюнкі А. Таранды.**

**АД РЭДАКЦЫІ: Сапраўды, факты адзінкавыя і непрыемныя. Мы спадзяемся, што грамадскасць універсітэта, камітэт камсамола і прафсаюзная арганізацыя тэрмінова прымуць самыя неадкладныя меры.**

Рэдактар А. ЛОЙКА.

АТ 03552. Адрас рэдакцыі: г. Мінск, БДУ імя Ул. І. Леніна, галоўны корпус, п. 212, тэл. 2-07-19. Друкарня выдавецтва «Звязда». Зак. 1288